*Бусько С. І.*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры, Мінск

*Busko S.*
Belarusian State University of Physical Culture, Minsk

**УДК 351.746.1(476)(091)**

## АСОБНЫ КОРПУС ЖАНДАРАЎ І СІСТЭМА НАГЛЯДУ ЗА ПАЛІТЫЧНЫМІ ПАРТЫЯМІ Ў БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯХ У 1907–1914 ГАДАХ

## SPECIAL CORPS OF GENDARMES AND SURVEILLANCE SYSTEM FOR POLITICAL PARTIES IN BELARUSIAN PROVINCES IN 1907–1914

*Артыкул прысвечаны дзейнасці Асобнага корпуса жандараў у пачатку XX ст. Асаблівая ўвага надаецца арганізацыі нагляду за палітычнымі партыямі ліберальнага і радыкальнага кірунку ў беларускіх губернях у 1907–1914 гг. Зроблена выснова, што ў разглядаемы перыяд дзяржаўная палітыка па ўсталяванні грамадскага парадку дасягнула поспеху, і дзейнасць палітычных партый была цалкам пад паліцэйскім кантролем.*
*Ключавыя словы: палітычная паліцыя; жандарскае ўпраўленне; ахоўнае аддзяленне; палітычны вышук; палітычныя партыі; перлюстрацыя; правакацыя; рэвалюцыйны рух; агентура.*

*The article is devoted to the activities of Special Corps of Gendarmes in the early 20th century. Particular attention is paid to the organization of supervision over political parties, liberal and radical trends in the Belarusian provinces in 1907–1914. It is concluded that in the period under review the state policy for the establishment of public order has reached success and activities of political parties was completely under police control.*
*Keywords: political police; gendarme department; Okhrana; political search; political parties; perusal; provocation; revolutionary movement; secret agents.*

Трэцячэрвеньскі пераварот 1907 г. фактычна скончыў рэвалюцыйны перыяд у развіцці Расійскай імперыі і паставіў палітычную паліцыю краіны перад праблемай арганізацыі палітычнага кантролю ў новых умовах. У гэты час склалася аптымальная сістэма палітычнага вышуку на тэрыторыі Беларусі: 70 унтэр-афіцэрскіх жандарскіх пунктаў – 16 павятовых жандарскіх ўпраўленняў – пяць губернскіх жандарскіх упраўленняў (ГЖУ) – Паўночна-Заходняе Раённае ахоўнае аддзяленне – Асобны Корпус жандараў (АКЖ). Для забеспячэння асобных функцый палітычнай паліцыі існавалі 5 упраўленняў на чыгунцы, чатыры крапасныя жандарскія каманды, контрразведка і ахоўныя аддзяленні ў Беластоку і Вільні. У 1907–1908 гг. адбыліся якасныя змены ў дзейнасці Дэпартамента паліцыі, але па-ранейшаму галоўным аб’ектам назірання заставаліся палітычныя партыі, прафесійныя і грамадскія аб’яднанні.

Аднак вектар увагі ўстаноў палітычнай паліцыі памяняўся. Калі ў 1905–1907 гг. асноўнае назіранне ажыццяўлялася за рэвалюцыйнымі партыямі і праявамі іх дзейнасці, то зараз акцэнт быў зроблены на стварэнне сістэмы кантролю як над рэвалюцыйнымі, так і над ліберальнымі партыямі. Больш за тое, аналіз падзей Першай рускай рэвалюцыі прывёў Асобы аддзел Дэпартамента паліцыі да высновы, што «главную руководящую роль в русском революционном движении играло и продолжает играть так называемое общественное или оппозиционное движение» [1, арк. 121]. Адпаведна перад вышуковымі органамі на месцах была пастаўлена задача поўнага кантролю над «конституционно-демократической и трудовой народно-социалистической партиями». Іх імкненне да звяржэння самадзяржаўя праз легальныя формы дзейнасці было прызнана найбольш небяспечным для Расійскай імперыі.

Барацьба з антыўрадавым рухам ліберальных арганізацый, на думку Дэпартамента паліцыі, была найбольш складаная для палітычнай паліцыі. Таму асноўны цяжар павінен быць ускладзены на губернскія ўлады. Цыркулярам № 63021 ад 17 лістапада 1911 г. на губернатараў быў ускладзены абавязак штомесячна рабіць справаздачы ў Дэпартамент паліцыі аб настроях «различных групп населения, прессы, политических партий (кадетской и правее её стоящих), просветительских организаций и т. п.» [2, с. 50]. Дзейнасць губернскіх жандарскіх упраўленняў у дадзеным пытанні мела толькі выканаўчы характар. Так, кіраўнік Віленскага ахоўнага аддзялення ротмістр В. Калакалоў адзначаў у справаздачы за 1908 г. павелічэнне колькасці членаў Партыі Народнай Свабоды ў Вільні, і на люты 1908 г. вызначаў іх колькасць у горадзе ў 100 чалавек на чале з рэдактарам «Свободного слова»

І. Ромам. На падставе агентурных звестак у згаданага Рома быў праведзены вобыск і знойдзена больш за 500 выданняў. Аднак рэпрэсіўныя меры ў адносінах да ліберальных партый былі рэдкай з'явай. На думку МУС, лібералы і сацыялісты імкнуцца да аднолькавых мэт, толькі рознымі сродкамі. Таму выпадкі іх супрацоўніцтва прыпыняліся амаль адразу [3, с. 135].

У адносінах да рэвалюцыйных партый жандарская тактыка амаль не змянілася: актыўнае выкарыстанне ўнутранай агентуры, сістэматызацыя наяўнай інфармацыі на мясцовым і агульнаімперскім узроўнях, дасканалае вывучэнне праграмных дакументаў і матэрыялаў партыйных з'ездаў дазваляла чынам ГЖУ і ахоўным аддзяленням цалкам кантраляваць антыўрадавы рух. Здараліся выпадкі, калі ліквідацыя нелегальных гурткоў ажыццяўлялася па спісе, напрыклад, з «Известий народно-социалистической партии, № 1». Адначасова пашыралася ўжыванне новых тэхнічных сродкаў: дактыласкапіі, фотаздымкаў. У 1908–1913 гг. небывалы памер набыла сакрэтная агентура, у параўнанні з 1904 г. яе колькасць узрасла амаль у тры разы.

Па кожнай з сур'ёзных палітычных партый у беларускіх губернях зараз налічвалася не менш за 10–15 агентаў. Больш за 40 супрацоўнікаў адначасова асвятляла дзейнасць БУНДа: ад І. Каплінскага (удзельнік 4 з 7 першых з'ездаў БУНДа) да «Николаевского» (член бундаўскага гуртка ў Віцебску). Больш за 30 чалавек працавала па РСДРП і ПСР. Нават па дробных партыях і саюзах існавала ўнутранная агентура: Л. Дворкін з 1908 г. даваў звесткі па нелегальным Чыгуначным саюзе ў Віцебскай губерні, штучнікі «Сосновский» і «Рукавица» ў 1909–1910 гг. асвятлялі дзейнасць Ваенна-рэвалюцыйнай арганізацыі ў Дзвінску. З пяці ўдзельнікаў нарады камітэта ППС у 1908 г. у Гродзенскай губерні адзін быў супрацоўнікам Гродзенскага губернскага жандарскага ўпраўлення [4, арк. 31]!

Як вынік, за 1908–1910 гг. актыўны рэвалюцыйны рух у беларускіх губернях быў знішчаны ці знаходзіўся пад наглядам. Дэпартамент паліцыі нават дасылае па ГЖУ інструкцыі-парады па аператыўнай дзейнасці: «существеннее всего будет обезвредить руководящие верхи, центры, а никак не начинать снизу, с неотдающей себе отчета массы» [1, арк. 126]. Напрыклад, Гомельскі камітэт ПСР у 1909 г. актыўнай дзейнасці не вёў, і таму, нават ведаючы поўны асабовы склад, мясцовае ГЖУ яго не арыштавала. За 1908–1911 гг. былі ліквідаваны: Віцебская, Магілёўская і Мінская арганізацыі ПСР, ваенная арганізацыя РСДРП у Дзвінску, група анархістаў-камуністаў Ш. Александровіча ў Беластоку, двойчы ліквідаваўся віленскі гурток БУНДа і інш. [3, с. 129].

З 1907–1908 гг. узрастае хуткасць перадачы аналітычнай інфармацыі з Дэпартамента паліцыі ў мясцовыя ўстановы палітычнага вышуку. Дэпартамент паліцыі пільна высочвае ўсе партыйныя з'езды і вывучае іх змест. У адпаведнасці з рэзалюцыямі партыйных канферэнцый і карэктуецца дзейнасць палітычнай паліцыі. Так, у 1908 г. кіраўнік Паўночна-Заходняга Раённага ахоўнага аддзялення дасылае па пяці беларускіх губернскіх жандарскіх упраўленнях матэрыялы пасяджэння ЦК РСДРП аб актывізацыі эканамічнай барацьбы з-за адсутнасці умоў для палітычных выступленняў і адпраўцы для гэтага членаў ЦК у правінцыю. Адпаведна беларускім ГЖУ рэкамендуецца больш увагі надаць эканамічным выступленням рабочых і арышту агітатараў [4, арк. 213]. Па губернскіх жандарскіх упраўленнях дасылаюцца «Краткий обзор печатных органов», у тым ліку выданняў ПСР («Мысль», «За рубежом», «Жизнь», «Наше эхо»), анархістаў («Голос труда»), РСДРП («Наше слово», «Социал-демократ») і інш., а таксама інфармацыйныя лісткі Паалей-Цыёну, інструкцыі IX канферэнцыі БУНДа [1, арк. 288–316].

Кожнае жандарскае ўпраўленне двойчы на год дасылала ў Дэпартамент паліцыі справаздачы па ўсіх палітычных партыях, якія дзейнічалі на іх тэрыторыі. Пасля абагульнення і аналізу ў Асобым аддзеле інфармацыйныя запіскі размяркоўваліся па ГЖУ і ахоўных аддзяленнях. Так, у верасні 1909 г. колькасць членаў Літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыі ацэньвалася Дэпартаментам паліцыі ў 3–5 тыс. чалавек, БУНДа – 10 тыс. чалавек, Паалей-Цыёну і сацыял-сіяністаў – прыкладна 2 тыс. чалавек. Узровень валодання матэрыялам нават дазваляў рабіць прагнозы: «объединение ППС-левицы и СДКПиЛ – вопрос ближайшего будущего» [5, арк. 6].

Па данясеннях жандарскіх упраўленняў у Дэпартамент паліцыі дзейнасць эсэраў, эсдэкаў і бундаўцаў пасля бурных падзей 1905–1907 гг. амаль па ўсіх губернях звялася да прапаганды сярод рабочых і сялян, у значнай меры праз афіцыйныя мерапрыемствы. Асабліва непакоіў ахоўныя аддзяленні прафсаюзны рух. Для кіраўніцтва Дэпартамента паліцыі было зразумела, што легальныя мэты прафесійных саюзаў з'яўляюцца толькі шырмай, якая прыкрывае іх антыўрадавы характар: «здесь собран цвет революционеров – рабочие интеллигенты». Гэта пацвярджалася і матэрыяламі з'ездаў і канферэнцый партый, якія паступалі ў ГЖУ. Праз некалькі дзён пасля сканчэння працы VII Міжнароднага сацыялістычнага кангрэсу ў Штутгарце Асобы аддзел Дэпартамента паліцыі распаўсюдзіў сярод кіраўнікоў ахоўных аддзяленняў і ГЖУ цыркуляр № 137020 з вынікамі кангрэсу, у тым ліку і аб адносінах

да прафесійнага руху. Адпаведная пазіцыя была сфарміравана ў цыркуляры МУС: «Допускать легализацию профессиональных союзов лишь при наличии несомненных фактов об отсутствии их связей с социал-демократическими группами. При достаточности оснований по обвинению активных членов таких союзов в принадлежности к революционным сообществам – возбуждать уголовное дело» [6, арк. 56].

Улік рэальных ці магчымых ворагаў урада вёўся працяглы час. Архіў Дэпартамента паліцыі фарміраваўся на персанальных картках і няспынна развіваўся. Да пачатку Першай сусветнай вайны ён налічваў больш за мільён картак [7, с. 253]. Але нягледзячы на памеры база была выдатна сістэматызавана з дапамогай храналагічнага і алфавітнага прынцыпаў. Акрамя таго, выкарыстоўвалася каляровае афармленне: карткам партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў быў нададзены чырвоны колер, сацыял-дэмакратаў – блакітны, анархістаў – зялёны, жоўты колер атрымалі студэнты і навучэнцы. На белыя карткі заносілася інфармацыя аб кадэтах і асобах, што палітыкай актыўна не займаліся, але мелі магчымасць паўплываць на грамадства ў непажаданым для ўрада кірунку.

Зніжэнне актыўнасці агульнарасійскіх рэвалюцыйных партый дазволіла палітычнай паліцыі сур'ёзна звярнуцца да больш дробных тэрытарыяльных партый, у тым ліку і да БСГ. У 1908–1910 гг. у Віленскім жандарскім упраўленні ў межах палітычных аглядаў былі падрыхтаваны дзве дакладныя запіскі пад назвай «Обзор истории революционного движения в Белоруссии и возникновение Громады». Яны амаль цалкам засяваны на артыкуле А. Луцкевіча [8, арк. 1–5; 9, с. 31–40]. Відавочна, што чыны ахоўных аддзяленняў і ГЖУ ў 1909 г. някепска ведалі асаблівасці Беларускай сацыялістычнай грамады: «БСГ (B.S.H.) имеет расплывчатую программу, нечто среднее между социал-демократами и социалистами-революционерами. По тактике ближе к первым, т. е. не признает террор… входили в ЦК партии А. Власов (революционная кличка «Старший»), братья И. и А. Луцкевичи (соответственно «Сченсный» и «Генрих») … лидская мещанка А. Пашкевич» [8, арк. 6, 19].

Адной з важнейшых крыніц інфармацыі заставаліся матэрыялы перлюстрацыі. Яны з'яўляліся важнай часткай вышуковай дзейнасці палітычнай паліцыі, былі крыніцай інфармацыі аб дзейнасці рэвалюцыйных арганізацый, настроях сярод насельніцтва, у грамадскіх і палітычных аб'яднаннях. Трэба адзначыць, што ў гэты час паштовыя і тэлеграфныя ўстановы знаходзіліся ў падначаленні МУС [10, с. 72]. Перлюстрацыя ажыццяўлялася на двух узроўнях. Спецыяльныя «чорныя кабінеты» існавалі на паштамтах 8 гарадоў, прычым віленскі філіял быў зачынены яшчэ ў 1890-я гг. У астатніх гарадах па патрабаванні кіраўніка ГЖУ прагляду маглі быць падвергнуты пісьмы любой асобы, нават губернатара, але азнаёміцца са зместам мог толькі сам кіраўнік упраўлення і толькі ў памяшканні пошты. Па загаду міністра ўнутранных спраў В. Плеве ў 1903 г. кіраўнікам палітычнага вышуку пачалі выдаваць «открытые листы». Яны былі імянныя і надавалі ўласніку права догляду паштова-тэлеграфнай карэспандэнцыі [11, с. 97].

Уся перлюстрацыя падзялялася на «алфавіт» і выпадковую выбарку. «Алфавіт» азначаў спіс асоб, карэспандэнцыя якіх прызначалася да абавязковага прагляду. Ён складаўся Асобым аддзелам Дэпартамента паліцыі і ў розныя гады налічваў ад 300 да 1000 прозвішчаў па ўсёй Расійскай імперыі. Аб такіх пісьмах адразу паведамлялася ў ГЖУ. Пры выпадковым адборы супрацоўнікі пошты звярталі ўвагу на аб'ём пісьма, почырк, адрас карэспандэнта (напрыклад, цэнтр замежнай эміграцыі – Жэнева). Паколькі перлюстрацыя была незаконнай справай, следства не спасылалася на атрыманыя матэрыялы. Нават ахоўныя аддзяленні і ГЖУ атрымлівалі з Дэпартамента паліцыі такую інфармацыю з пазнакай «агентурныя звесткі». Больш таго, сакрэтнасць была перашкодай пры ўзаемадзеянні з чыноўнікамі на пошце. Так, спасылаючыся на тайну перапіскі, паштовыя чыноўнікі двойчы адмоўна адказвалі на запыт Мінскага ГЖУ наконт адрасатаў заказной карэспандэнцыі. Толькі з трэцяй спробы, пасля спасылкі жандараў на адпаведныя законы, у ГЖУ былі перададзены неабходныя дадзеныя [12, с. 101].

Падзеі рэвалюцыі 1905–1907 гг. падштурхнулі царскі ўрад да стварэння прадстаўнічага органа ўлады – Дзяржаўнай думы. Як вынік, перад палітычнай паліцыяй паўстала пытанне аб забеспячэнні дзяржаўных інтарэсаў падчас выбараў у парламент. Неабходна прызнаць, што і ў дадзеным выпадку супрацоўнікі Дэпартамента паліцыі для вырашэння задач неаднаразова парушалі заканадаўства. Так, напярэдадні выбараў у IV Думу Дэпартамент паліцыі прасіў жандараў сабраць інфармацыю па наступных пытаннях: 1) аб настроях выбаршчыкаў; 2) аб адносінах інтэлігенцкіх слаёў і народных мас да дэпутатаў і ацэнка іх дзейнасці; 3) аб перадвыбарнай працы палітычных партый; 4) аб асобах, якія імкнуцца да абрання ў члены Дзяржаўнай думы, іх палітычнай накіраванасці і шанцах. Цікавасць уяўляе, напрыклад, адказ намесніка кіраўніка Гродзенскага ГЖУ па Гродзенскім і Слонімскім паветах на гэтыя пытанні: «Население настроено оппозиционно, но к выборам относится индифферентно … отношение к депутатам Государственной Думы

самое безразличное, кажется, мало кто размышлял о ее деятельности» [13, арк. 57, 95].

Падводзячы вынікі, неабходна адзначыць, што перыяд 1907–1914 гг. стаў найбольш паспяховым у дзейнасці палітычнай паліцыі ў беларускіх губернях. Сістэма палітычнага вышуку паставіла пад пільны кантроль рэвалюцыйны рух, дзякуючы новым метадам працы здолела арганізаваць механізм папярэджвання рэвалюцыйных выступленняў і грамадскіх хваляванняў і пашырыла сферы сваёй дзейнасці ў грамадстве: мастацтва, рэлігійныя аб'яднанні, дробныя нацыянальныя рухі, прафсаюзы, ухіленне ад прызыву трапілі пад нагляд.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Циркуляры Департамента полиции о надзоре за деятельностью политических партий (РСДРП, социалистов-революционеров, сионистов-социалистов, БУНДа и польской социалистической партии) // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (далей – НГАБ у г. Гродна). – Ф. 369. – Воп. 1. – Спр. 75.

2. *Ченцов, В.* Свідчать документи: Політичний розшук у царській Росії. Жандармерія і Охранка / В. Ченцов // З архівів ВУЧК-ГПУ-НКВД-КГБ. – 2001. – № 2(17). – С. 5–281.

3. *Бригадин, П. И.* Эсеры в Беларуси (конец XIX в. – февраль 1917 г.) / П. И. Бригадин. – Минск: Згода, 1994. – 152 с.

4. Переписка с Департаментом полиции, помощниками начальника Гродненского губернского жандармского управления и др. о наблюдении за деятельностью РСДРП, анархо-коммунистов, социалистов-революционеров // НГАБ у г. Гродна. – Ф. 366. – Воп. 1. – Спр. 105.

5. О Белорусской социалистической Громаде // Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (ДА РФ). – Ф. 102. – Воп. 238. – Спр. 248.

6. Циркуляры МВД, Департамента полиции, Главного управления по делам местного хозяйства и т. п. о предоставлении губернаторам права изменять утвержденные уставы, о Штутгартском международном социалистическом конгрессе и ведением борьбы с распространением социал-демократических и социал-революционных идей // НГАБ у г. Гродна. – Ф. 103. – Воп. 1. – Спр. 1.

7. *Реент, Ю. А.* Общая и политическая полиция России (1900–1917 гг.) / Ю. А. Реент. – Рязань: Узоречье, 2001. – 284 с.

8. Переписка с начальником Виленского губернского жандармского управления о руководстве и деятельности партии Белорусская соц. Громада // ДА РФ. – Ф. 267. – Воп. 1. – Спр. 59.

9. *Луцкевіч, А.* Да гісторыі беларускага руху: Выбраныя творы / А. Луцкевіч; укл., прадм., камент. А. Сідарэвіча. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 2003. – 288 с.

10. *Смыкалин, А. С.* Перлюстрация корреспонденции и почтовая цензура в России и СССР / А. С. Смыкалин. – СПб.: Юрид. центр Пресс, 2008. – 317 с.

11. *Гончарова, Е. А.* Система перлюстрации в России в конце XIX – начале XX в. / Е. А. Гончарова // Вопросы истории. – 2008. – № 1. – С. 96–102.

12. *Гронский, А. Д.* Борьба против политического движения на территории Беларуси во второй четверти XIX – начале XX в. / А. Д. Гронский // Исторический поиск Беларуси: альманах / сост. А. Ю. Бендин. – Минск: Экономпресс, 2006. – С. 91–105.

13. Переписка с начальником Виленского губернского жандармского управления и помощников начальника Гродненского губернского жандармского управления об установлении усиленного надзора за деятельностью политических партий в связи с выборами в IV Государственную Думу // НГАБ у г. Гродна. – Ф. 366. – Воп. 1. – Спр. 193.

**Дата паступлення: 09.10.2018.**